УДК 069.51:[908+39](476)

# МУЗЕЙНАЯ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ СЯДЗІБНАЙ ПРАСТОРЫ ЯК НОСЬБІТА КУЛЬТУРНАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Д. В. ГЕРАСІМЁНАК
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
Мінск, Беларусь

**Уводзіны.** Галоўнай умовай актуалізацыі спадчыны з'яўляецца яе музеефікацыя, пры дапамозе якой нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці пераўтвараюцца ў музеі мемарыяльнага ці краязнаўчага профілю. Музейнымі ўстановамі выпрацаваны традыцыі і прынцыпы выкарыстання сядзібна-паркавых комплексаў, заснаваныя на спробах мемарыялізацыі жыцця і дзейнасці пэўнай асобы, якая валодала выдатным інтэлектуальным патэнцыялам, высокім узроўнем ведаў, была аддана Радзіме і таленавіта не толькі ў галіне прафесійнай дзейнасці, але і мела высокі маральны аўтарытэт.

**Асноўная частка.** Падрыхтоўка да музеефікацыі сядзібы пачынаецца са збору матэрыялу, звязанага з жыццядзейнасцю вядомай асобы на тэрыторыі пэўнага рэгіёна, вывучэння мемарыяльных месцаў і прызначанага да музеефікацыі сядзібнага дома: яго архітэктуры, гісторыі існавання і перабудоў, ступені захаванасці, кола людзей, якія жылі, або так ці інакш звязаны з ім. Выяўляецца перыяд жыцця і дзейнасці мемаруемай асобы. Шырокі дакументальны матэрыял, пошук якога нярэдка займае шмат гадоў і працягваецца пасля адкрыцця музея, дае магчымасць экспазіцыянерам быць дакументальна дакладнымі, не дапускаць прыблізнасці і гіпотэз. Натурныя даследаванні дома рэстаўратары вядуць сумесна з супрацоўнікамі музея.

Важнейшым этапам пры стварэнні музеяў-сядзіб з'яўляецца камплектаванне фондаў, выбар музейных прадметаў і экспазіцыйных матэрыялаў, якія будуць напаўняць мемарыяльную прастору музея і складуць аснову будучай экспазіцыі. Як правіла, для гэтага праводзяцца даследаванні гісторыі асобных прадметаў, якія знаходзіліся ў сядзібным доме, вядзецца выяўленне магчымых уладальнікаў, наладжваюцца кантакты з роднымі і нашчадкамі мемаруемай асобы (напрыклад, Радзівілаў, Чапскіх і інш.).

Размяшчэнне музея ў сядзібным доме мае на ўвазе арганізацыю экспазіцыйнай прасторы па тыпу жылога асяроддзя. Адзначым, што ў Беларусі склалася пэўная ўстойлівая схема арганізацыі экспазіцыі мемарыяльных музеяў-сядзіб. У адной частцы сядзібнага дома ствараецца спецыфічнае мемарыяльнае асяроддзе, у той ці іншай ступені набліжанае да свайго правобраза – дома, у якім пражываў чалавек. Яно прызначана раскрыць істотныя рысы характару асобы, яе ладу жыцця, густаў і інтарэсаў. Ствараецца так званая творчая лабараторыя гаспадара. У другой частцы арганізуецца экспазіцыя, якая змяшчае сукупнасць звестак пра мемаруемую асобу (біяграфія, вехі творчай, грамадскай дзейнасці і г. д.). Гэтая частка экспазіцыі можа насіць гісторыка-бібліяграфічны, гісторыка-літаратурны, гісторыка-культурны і іншы характар (напрыклад, музей-сядзіба Ф. Багушэвіча «Кушляны»). Часам можа вылучацца структурная частка

экспазіцыі, прысвечаная сядзібе, гісторыі яе будаўніцтва, рэстаўрацыі, іншым уладальнікам і насельнікам [64, с. 299].

Ступень свабоды экспазіцыянера, які працуе ў мемарыяльным доме, залежыць у першую чаргу ад захаванасці інтэр'ераў. Пры высокай ступені іх каштоўнасці адзіна магчымым шляхам стварэння экспазіцыі з'яўляецца дакладнае вызначэнне і захаванне месца кожнага прадмета, кожнай дробязі як сведчанняў былой гісторыі. Гэты метад падобны да кансервацыі. Такі ўзровень аўтэнтычнасці магчыма падтрымліваць толькі там, дзе мемарыяльнае асяроддзе было зафіксавана (напрыклад, музей-сядзіба І. Я. Рэпіна «Здраўнёва»).

У мемарыяльнай прасторы, якая захавалася часткова, ужываецца метад пабудовы экспазіцыі, параўнальны з фрагментарнай рэстаўрацыяй (аналітычнай). Ён заснаваны на вывучэнні крыніц і рэканструкцыі інтэр'ераў з выкарыстаннем аналогій, тыповых прадметаў. У гэтым выпадку ад вопыту і ведаў музейных спецыялістаў будзе залежаць лёс музея, які можа стаць дакладным і поўным узнаўленнем мемарыяльнага асяроддзя (напрыклад, Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс), а можа ператварыцца ў грубую фальсіфікацыю або пазбаўлены індывідуальнасці новабуд. Фрагментарны падыход быў выкарыстаны пры аднаўленні музея-сядзібы М. К. Агінскага, гісторыка-мемарыяльнага музея «Сядзіба Нямцэвічаў«.

Музей можа стварацца на месцы сядзібы, пазбаўленай інфармацыйнага напаўнення, у якой адсутнічае мемарыяльнае асяроддзе і яе нельга ўзнавіць. У гэтым выпадку задача экспазіцыянера – знайсці музейныя сродкі для больш выразнага фарміравання ўяўленняў аб ладзе жыцця гаспадара, часе яго пражывання ў доме, пэўных падзеях і г. д. Такі варыянт выкарыстаны пры стварэнні музея-сядзібы Міцкевічаў «Завоссе».

Пэўная колькасць былых сядзіб на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўваецца пад краязнаўчыя музеі (форма «пад музей»). Экспазіцыі прысвечаны сацыякультурнаму развіццю асобнага рэгіёна ці творчасці мясцовых дзеячаў у галіне гісторыі, навукі, эканомікі, культуры, што вызначае спецыфіку дзейнасці музеяў. Прыкладамі такога падыходу могуць служыць сядзібы Аўрамавых (Хойніцкі раённы краязнаўчы музей), Бонч-Асмалоўскіх (Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей). Краязнаўчыя экспазіцыі маюць і іншыя музеі, што размешчаны ў сядзібна-паркавых комплексах Беларусі.

**Заключэнне.** Тэндэнцыяй апошніх дзесяцігоддзяў з'яўляецца імкненне захаваць сляды працяглай гісторыі кожнага сядзібна-паркавага комплекса Беларусі і раскрыць у музейнай экспазіцыі ўсе перыяды яго існавання. Імкненню да поўнай рэканструкцыі «на аптымальную дату», якой для мемарыяльнага дома з'яўляецца час жыцця ў ім мемаруемай асобы, сёння саступае месца цікавасці да ўсіх часавых пластоў яго бытавання. Бытавізм мемарыяльнай часткі экспазіцыі музеяў-сядзіб забяспечвае лёгкасць змены іх канцэпцыі, пашырэння тэмы, нават перапрафілявання.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Каулен, М. Е.** Музеефикация историко-культурного наследия России / М. Е. Каулен. – Москва : Этерна, 2012. – 432 с.